# Цана Перамогі

Зборнік дакументаў "Без тэрміну даўнасці. Беларусь" прэзентавалі ў Нацыянальнай бібліятэцы.

Галаўной арганізацыяй пры рэалізацыі шматтомнага фундаментальнага праекта з серыі "Без тэрміну даўнасці" аб злачынствах нацыстаў і іх памагатых супраць мірнага насельніцтва Беларусі стаў Нацыянальны архіў Беларусі, які мае вялікі вопыт у галіне публікацыі дакументаў ваеннага перыяду. Сабраныя матэрыялы — бясспрэчны доказ зверстваў фашысцкіх акупантаў.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга Чупрыс адзначыла, што генацыд з'яўляецца выключна цынічным злачынствам і ўяўляе павышаную грамадскую небяспеку, таму любое апраўданне генацыду і яго адмаўленне ўжо злачыннае па сутнасці. У Беларусі, між тым, прыняты закон аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму. Намеснік кіраўніка Адміністрацыі асабліва падкрэсліла, што з пункту гледжання гэтага закона пад беларускім народам разумеюцца ўсе савецкія грамадзяне, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі. Беларусы, рускія, украінцы і іншыя грамадзяне змагаліся разам, плячо ў плячо, іх аб'ядноўвала агульная мэта — абарона Радзімы.

Генпракуратурай праводзіцца расследаванне маштабнай крымінальнай справы аб генацыдзе. Да яго падключыліся і іншыя ведамствы, эксперты, гісторыкі і проста неабыякавыя людзі.

Як адзначыла Вольга Чупрыс, толькі заканадаўчых мер, работы праваахоўнага блока недастаткова, прыярытэтнае значэнне мае гісторыка-прававая асвета:

— Важна, каб нашы грамадзяне, асабліва маладое пакаленне, разумелі жах і трагізм падзей таго часу. Менавіта на дасягненне гэтай мэты і накіраваны праект "Без тэрміну даўнасці".

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі ўпэўнена, што, азнаёміўшыся са зместам зборніка, людзі змогуць нанова пераасэнсаваць многія гістарычныя падзеі, даць ім правільную ацэнку, ушанаваць памяць герояў і ахвяр вайны:

— І самае галоўнае — зразумець, якой цаной дасталася нам Перамога.

**Па матэрыялах БелТА падрыхтавала Кацярына РУМЯНЦАВА.**